# Полацкі напрамак

## Як у 1944 годзе вызвалялі сталіцу старажытнай Беларусі

**У той час як 3 ліпеня 1944 года вольны Мінск радасна і сардэчна вітаў сваіх воінаў-вызваліцеляў, у другой беларускай сталіцы – старажытнай – Полацку ішлі надзвычай жорсткія баі. Фашысты прыкладалі неймаверныя намаганні, каб утрымаць горад. Яшчэ больш сіл і стратэгічнага і аператыўна-тактычнага ўмельства спатрэбілася войскам 1-га Прыбалтыйскага фронту, каб выканаць пастаўленую перад імі задачу па знішчэнні полацкай групоўкі праціўніка.**
**А між тым Чырвоная армія магла вызваліць Полацк на 8 месяцаў раней – у пачатку лістапада 1943-га для гэтага былі створаны пэўныя перадумовы.**

### За 35 км ад Полацка

Развіццё падзей у канцы чэрвеня – пачатку ліпеня 1944 года пад Полацкам было цесна звязана з агульнай сітуацыяй, што склалася на савецка-германскім фронце крыху раней, у сярэдзіне 1943 года.

– Пасля паспяховага завяршэння Курскай бітвы Чырвоная армія перайшла ў агульнае наступленне на паўднёвым і цэнтральным участках савецка-германскага фронту, – гаворыць загадчык філіяла «Музей баявой славы» Полацкага нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка Сяргей Капыл. – З мэтай недапушчэння перакідвання праціўнікам туды дадатковых воінскіх падраздзяленняў, размешчаных на паўночна-заходнім тэатры ваенных дзеянняў, Стаўкай Вярхоўнага галоўнакамандавання было прынята рашэнне аб правядзенні сіламі Заходняга і левага крыла Калінінскага франтоў Смаленскай стратэгічнай наступальнай аперацыі. А па яе завяршэнні запатрабаваліся актыўныя дзеянні і на правым крыле Калінінскага фронту: савецкім войскам была пастаўлена задача вызваліць горад Невель – стратэгічна важны транспартны вузел, які размяшчаўся на стыку нямецкіх груп армій «Поўнач» і «Цэнтр»…

У выніку жорсткіх 5-дзённых – з 6 па 10 кастрычніка 1943 года – баёў 3-я і 4-я ўдарныя арміі Калінінскага фронту пры падтрымцы 3-й паветранай арміі не толькі вызвалілі Невель, але і авалодалі шэрагам населеных пунктаў у яго наваколлі. Акрамя гэтага, як і планавалася, савецкім войскам удалося «ўбіць клін» паміж нямецкімі групамі армій «Поўнач» і «Цэнтр». Тым не менш праціўнік, перайшоўшы ў глыбокую абарону, працягваў упарта супраціўляцца і нават рабіў захады, праўда, беспаспяховыя, каб вярнуць пад свой кантроль Невель. Але наступальны парыў Чырвонай арміі паступова рабіў сваю справу: на працягу другой паловы кастрычніка ў лакальных баях войскі правага крыла Калінінскага (пасля 20 кастрычніка 1943 года – 1-га Прыбалтыйскага) фронту кіламетр за кіламетрам адваёўвалі ў ворага захопленую ім тэрыторыю і ўшчыльную наблізіліся да сучаснай мяжы Расійскай Федэрацыі з Беларуссю.

А ўжо ў пачатку лістапада, скарыстаўшыся адсутнасцю на паўднёва-заходнім напрамку ад Невеля суцэльнай лініі фронту і ўдала абыходзячы ачагі абароны праціўніка, асобныя падраздзяленні 4-й ударнай арміі распачалі свой вызваленчы паход на По-



лацк. 6 лістапада яны авалодалі станцыяй Алёшча і наблізіліся да вёскі Дрэтунь, таксама размешчанай на чыгунцы Невель – Полацк. Гэты баявы рэйд быў здзейснены з пэўнай доляй дзёрзкасці, бо войскі, што пайшлі ў наступленне, на некаторы час аказаліся адарванымі ад асноўных сіл і баз забеспячэння. Тым не менш Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандавання манеўр падраздзяленняў 4-й ударнай арміі ў полацкім напрамку, у выніку якога была вызвалена невялікая беларуская чыгуначная станцыя, расцаніла як значны поспех. «На заходнім і паўднёва-заходнім напрамку ад Невеля нашы войскі, пераадольваючы супраціўленне праціўніка, працягвалі весці баі мясцовага значэння, у ходзе якіх авалодалі шэрагам населеных пунктаў, сярод якіх… і чыгуначная станцыя Алёшча» (у арыгінале Алеша. – *С.Г.*), – паведамлялася ў зводках Саўінфармбюро за 6 лістапада 1943 года.

Вораг ніяк не чакаў, што савецкія войскі адважацца ісці на Полацк. Таму нямецкаму камандаванню для падмацавання дрэтуньскай лініі абароны спешна давялося падцягваць дадатковыя сілы. Пад Дрэтунь праціўнік «кінуў» увесь наяўны ў яго ў Полацку рэзерв, нават адзін з паліцэйскіх палкоў быў экстранна зняты з карнай экспедыцыі супраць партызан Расоншчыны. Падмацаванне прыйшло своечасова, гэта і дапамагло ворагу выстаяць – раніцай 7 лістапада 421-ы стралковы полк 119-й гвардзейскай стралковай дывізіі перайшоў у наступленне, але ў жорсткім баі авалодаць Дрэтунню не змог. Некалькі наступных спроб савецкіх войскаў вызваліць згаданае паселішча таксама сустрэлі моцнае супраціўленне праціўніка.

Пра характар тых баёў адзін з іх непасрэдных удзельнікаў снайпер 421-га стралковага палка сяржант Мікалай Чуглакоў ва ўспамінах, запісаных ад яго краязнаўцамі горада Гукава Растоўскай вобласці, дзе ён жыў, паведамляў наступнае: «У станции Дретунь немцы сильно укрепились. Вдоль железной дороги они производили вырубку леса на 200 метров. С вышки у железной дороги все просматривалось и велась корректировка огня. Мы только из леса выдвинемся, нас накрывают пулеметным и минометным огнем, а то и самолеты вызывают. Командир посылает меня подобраться поближе и снять наблюдателя и пулеметчика. Пополз, дистанция подходящая. Сделал один выстрел, и меня обнаружили. Началась обработка минометным огнем, вжался в землю. Чувствую, зацепило правое плечо. Дождался темноты и пополз к своим. Медсанбат, госпиталь. Ранение оказалось серьезней, чем мне казалось…».

Нягледзячы на адчайнае супраціўленне ворага, заваяваныя пазіцыі чырвонаармейцы не здалі – каля вёскі Дрэтунь, ад якой да Полацка каля 35 км, умацавалася франтавая паласа.

## Змена прыярытэтаў

Аднак Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандавання ў 1943 годзе не адмовілася ад планаў па вызваленні Полацка, які меў для Чырвонай арміі важнае стратэгічнае значэнне. Авалоданне гэтым горадам давала магчымасць савецкім войскам зайсці ў тыл віцебскай групоўцы праціўніка, а таксама адкрывала падраздзяленням 1-га Прыбалтыйскага фронту добрыя перспектывы на наступленне на латвійска-літоўскім напрамку і на выхад да межаў Усходняй Прусіі.

– У снежні ў Полацка-Лепельскую партызанскую зону была накіравана аператыўная група ЦК Кампартыі Беларусі і Беларускага штаба партызанскага руху, – працягвае Сяргей Пятровіч. – Перад ёй, акрамя дадатковых паўнамоцтваў па каардынацыі баявых дзеянняў атрадаў і злучэнняў, была пастаўлена задача па падрыхтоўцы ў партызанскай зоне шэрагу аэрадромаў. Планавалася, што на іх самалётамі будзе дастаўлены адзін з паветрана-дэсантных карпусоў Чырвонай арміі, які стане ядром для фарміравання сумеснага ўдару аб'яднаных сіл Полацка-Лепельскай партызанскай зоны на Полацк з поўдня. Адначасова з імі з паўночнага, дрэтуньскага, напрамку павінны былі перайсці ў наступленне падраздзяленні 4-й ударнай арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту.

За параўнальна кароткі тэрмін аператыўнай групе ўдалося зрабіць многае, а найперш – падрыхтаваць аэрадромы для пасадкі транспартных самалётаў. Але ў другой палове снежня нечакана рэзка пацяплела, тэмпература паветра стала плюсавой, пайшлі бесперапынныя дажджы, якія змяніліся густымі туманамі. Падрыхтаваныя для прыёму дэсанта аэрадромныя

пазіцыі размяклі, ператварыліся ў балоты. Непрадбачаныя кліматычныя ўмовы спачатку паўплывалі на затрымку тэрмінаў правядзення аперацыі па вызваленні ад ворага старажытнай сталіцы Беларусі, а затым і на яе адмену. Справа ў тым, што на канец 1943 года на беларускім тэатры баявых дзеянняў правага крыла 1-га Прыбалтыйскага фронту змянілася раскладка сіл. На паўночным усходзе ад Полацка была паспяхова праведзена Гарадоцкая наступальная аперацыя. У выніку яе савецкія войскі зрушыліся з месца на 60 кіламетраў, разграмілі шэсць пяхотных і адну танкавую дывізіі праціўніка і, ліквідаваўшы Гарадоцкі выступ, стварылі ў пачатку 1944 года ўмовы для наступлення на Віцебск…

Пасля вызвалення Гарадка полацкі напрамак для савецкага камандавання часова стаў менш актуальным, бо асноўныя сілы Чырвонай арміі ў Падзвінскім рэгіёне цяпер былі скіраваны на Віцебск. Праўда, войскі 1-га Прыбалтыйскага і Заходняга франтоў, якія ў далейшым, у лютым – першай палове сакавіка 1944 года, у ходзе Віцебскай наступальнай аперацыі вялі баі за горад на Заходняй Дзвіне, дасягнуць пастаўленай мэты не змаглі – Віцебск вызваліць ім не ўдалося. Пад Полацкам жа ў гэты час было адноснае зацішша. «С октября 1943 года по июнь 1944-го мы стояли в обороне под Полоцком и вели бои местного значения. В обороне наша батарея стояла иногда до пяти километров от переднего края. Строили ложные огневые позиции, одно орудие из батареи кочевало: постреляем с одного места, моментально переезжаем на другое, а немцы засекают этот сектор. Тем самым создавали видимость о сосредоточении техники в данном районе», – успамінаў пазней яшчэ адзін сведка колішніх баёў пад Дрэтунню ветэран-артылерыст Іван Касціцын, жыхар удмурцкага горада Глазаў.

## Перад наступленнем

Змяненне наступальных прыярытэтаў на карысць Віцебска зусім не азначала, што ў Стаўцы Вярхоўнага галоўнакамандавання пра Полацк забыліся наогул. Авалоданне гэтым горадам па-ранейшаму значылася ў стратэгічных планах камандавання Чырвонай арміі. Таму ў той час, як пад Віцебскам ішлі жорсткія баі з ворагам, на полацкім напрамку вялася падрыхтоўка да будучай аперацыі па вызваленні Полацка. Як бы складана ні было савецкім войскам на віцебскім напрамку, камандуючы 1-м Прыбалтыйскім фронтам генерал арміі І. Баграмян знаходзіў рэзервы і магчымасці для ўмацавання сваёй полацкай групоўкі. Асабліва напярэдадні наступлення на горад.

– Толькі для ўзмацнення 360-й Невельскай стралковай дывізіі 4-й ударнай арміі ў час планаванага наступлення на Полацк загадам камандуючага фронтам была створана артылерыйская група падтрымкі пяхоты ў складзе двух артдывізіёнаў і батарэі 120-міліметровых мінамётаў 16-й Літоўскай стралковай дывізіі, 2-га дывізіёна 20-й гвардзейскай Чырванасцяжнай брыгады і часткі 480-га гаўбічнага артылерыйскага палка, – гаворыць С. Капыл. – Прыкладна такія карэктывы ўносіліся ў баявыя парадкі і іншых падраздзяленняў 4-й ударнай, а таксама 6-й гвардзейскай армій, якім затым быў аддадзены загад аб наступленні на Полацк…

Варта зазначыць, што і ў ідэалагічным плане да аперацыі па вызваленні Полацка таксама быў зроблены грунтоўны падыход. Незадоўга да наступлення ў франтавой газеце «Вперед на врага» было апублікавана пісьмо-заклік да салдат 1-га Прыбалтыйскага фронту ўраджэнкі цяперашняй Расоншчыны Зінаіды Тусналобавай. Гэтая легендарная дзяўчына, будучы санітаркай у стралковай роце, за 8 месяцаў свайго знаходжання на фронце вынесла з поля бою 123 параненых. 2 лютага 1943 года на Курскай дузе яна была цяжка паранена сама. Больш за суткі праляжаўшы сярод загінуўшых аднапалчан, яна моцна абмарозілася. Яе выпадкова сярод мёртвых знайшла група савецкіх разведчыкаў. У шпіталі, куды затым даставілі адважную старшыну медслужбы, ёй зрабілі некалькі аперацый, але наступствы абмаражэння былі суровыя – яна страціла рукі і ногі. Распавёўшы ў лісце сваю гісторыю, дзяўчына звярнулася да салдат з заклікам:

«Отомстите за меня! Отомстите за мой родной Полоцк! Пусть это письмо дойдет до сердца каждого из вас. Это пишет человек, которого фашисты лишили всего – счастья, здоровья, молодости. Мне 23 года. Уже 15 месяцев я лежу, прикованная к

госпитальной койке. У меня теперь нет ни рук, ни ног… Это письмо я пишу обрубком правой руки, которая отрезана выше локтя. Мне сделали протезы, и, может быть, я научусь ходить. Если бы я хотя бы еще один раз могла взять в руки автомат, чтобы расквитаться с фашистами за кровь. За муки, за мою исковерканную жизнь!.. Я была вашим товарищем, шла с вами в одном ряду. Теперь я не могу больше сражаться. И я прошу вас: отомстите!.. Когда пойдете на штурм, вспомните обо мне!»

Зварот З. Тусналобавай аказаў вялікае псіхалагічнае ўздзеянне на байцоў фронту. Тая ж газета «Вперед на врага» друкавала лісты-водгукі, у якіх салдаты і афіцэры кляліся адпомсціць за гераічную дзяўчыну. А непасрэдна перад штурмам полацкіх умацаванняў ворага з'явіўся на брані асобных савецкіх танкаў, фюзеляжах самалётаў, ствалах гармат і нават на артылерыйскіх снарадах (салдаты фарбай пісалі) лозунг «За Зіну Тусналобаву!». У палках 3-й паветранай арміі былі адкрыты «рахункі помсты», на якіх акумуліравалася інфармацыя аб збітых самалётах праціўніка і нанесеным уроне яго абароне. Адметна, што неўзабаве пасля вызвалення Полацка З. Тусналобава, якой ужо ў пасляваенны час было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, пераехала ў гэты горад, дзе і пражыла да сваёй смерці ў 1980 годзе.

Асаблівую ўвагу вызваленню Полацка надаваў і асабіста Вярхоўны Галоўнакамандуючы І. Сталін. Як згадваў у кнізе сваіх мемуараў «Так шли мы к победе» І. Баграмян, Сталін у размове з ім падкрэсліваў важнасць гэтага моманту: «Я понимаю обстановку, сложившуюся в районе Полоцка. Учитывая важное оперативное значение этого крупного узла обороны для прикрытия рижского направления, гитлеровское командование крепко будет цепляться за Полоцк. К сожалению, Еременко (камандуючы 2-м Прыбалтыйскім фронтам. – *С.Г.*) еще не готов к переходу в наступление, а это позволило противнику значительно усилить полоцкую группировку. Несмотря на все это, вы должны принять самые решительные меры, чтобы возможно быстрее вышвырнуть немцев из Полоцка. Иначе вы можете упустить момент – противник сумеет затормозить дальнейшее наступление главных сил фронта на важном для нас каунасском направлении. Я распорядился усилить четвертую ударную армию одним стрелковым корпусом. Желаю вам успеха…».



▲ **Камандуючы 1-м Прыбалтыйскім фронтам генерал арміі І. Баграмян і начальнік штаба фронту У. Курасаў (злева направа) на камандным пункце каля г. Полацка. Канец чэрвеня – пачатак ліпеня 1944 года**

Зразумела, што і праціўнік не спаў у шапку, актыўна рыхтаваўся да адпору савецкім войскам падчас іх немінучага наступлення на Полацк. Для абароны горада нямецкае камандаванне задзейнічала шэсць дывізій, быў створаны моцны абарончы рубеж пад грознай назвай «Тыгр». Ён меў развітую сістэму палявых, а месцамі і доўгачасовых ўмацаванняў, вызначаўся цэлым шэрагам апорных пунктаў, прыкрытых інжынернымі загародамі і міннымі палямі. Азёры і балоты, якія распасціраліся ў наваколлі Полацка, таксама былі ўключаны ў лінію абароны, і яны значна ўзмацнялі непрыступнасць гэтага бастыёна. Ды і сам горад быў старанна падрыхтаваны да кругавой абароны, яго прыкрывала яшчэ адна лінія ўмацаванняў. Да таго ж у большасці цагляных будынкаў праціўнік уладкаваў доўгатэрміновыя агнявыя кропкі.

## Доўгачаканае вызваленне

У маі 1944 года ў Стаўцы Вярхоўнага галоўнакамандавання быў разгледжаны і ўхвалены план аперацыі «Баграціён» па вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Згодна з ім войскам 1-га Прыбалтыйскага фронту была пастаўлена задача нанесці ўдар і знішчыць віцебскую групоўку ворага. 23 чэрвеня савецкія войскі пачалі наступленне за поўнае вызваленне Беларусі. Прарваўшы нямецкую абарону на поўначы і на поўдні ад Віцебска, войскі

Беларуская Думка

адпаведна 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў акружылі і цалкам ліквідавалі віцебскую групоўку праціўніка, і 26 чэрвеня горад на Заходняй Дзвіне быў вызвалены. Услед за Віцебскам настала чарга і Полацка пазбавіцца ад ненавіснага ворага.

Перыпетыі па вызваленні савецкімі войскамі горада Полацка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў маюць даволі маштабны характар. Аднак мой суразмоўца С. Капыл, нягледзячы на тое, што прысвяціў гэтай тэме спецыяльнае даследаванне «Пятый Сталинский удар», якое нядаўна выйшла асобнай кнігай у выдавецкай серыі «Спадчына Полацкай зямлі», параіў звярнуцца да сціплай дэталізацыі падзей, зробленай камандуючым 1-м Прыбалтыйскім фронтам генералам арміі І. Баграмянам у яго мемуарах «Так шли мы к победе».

«…В период с 29 июня до 1 июля войска фронта упорно прорывались к Полоцку, – чытаем успаміны Івана Хрыстафоравіча. – Чем ближе подходили они к городу, тем ожесточеннее становилось сопротивление гитлеровцев. Полосы наступления корпусов постепенно сужались. Поэтому я приказал генералу И.М. Чистякову (камандуючы 6-й гвардзейскай арміяй. – *С.Г.*) вывести 103-й стрелковый корпус и направить его вдоль левого берега Западной Двины в общем направлении на Даугавпилс. 4-я ударная армия должна была обходом города с севера обеспечить окружение полоцкого гарнизона. Одновременно я потребовал от генерала И.М. Чистякова силами 22-го и 23-го гвардейских стрелковых корпусов быстрее прорваться к городу с востока и юга, решительной атакой разгромить противника и освободить Полоцк.

**▼ Савецкія салдаты на вуліцах вызваленага Полацка. Ліпень 1944 года**




К вечеру 1 июля соединения 22-го гвардейского стрелкового корпуса прорвались к восточной окраине Полоцка, тогда как дивизии 23-го гвардейского стрелкового корпуса все еще вели бои в 8–10 километрах южнее города, преодолевая ожесточенное сопротивление противника на очень тяжелой для наступления лесисто-болотистой местности…

30 июня я с оперативной группой прибыл в расположение 22-го гвардейского стрелкового корпуса, чтобы наладить тесное взаимодействие соединений 4-й ударной армии, 22-го и 23-го гвардейских стрелковых корпусов, наступавших на Полоцк. Побывав на восточных и юго-восточных подступах к городу, мы пришли к выводу, что решительный штурм его должен осуществляться одновременно со всех сторон: это не позволило бы противнику маневрировать силами и средствами. С этой целью были возобновлены атаки с севера, востока и юга. При этом внимание командующего 4-й ударной армией и командира 23-го гвардейского стрелкового корпуса было обращено на то, чтобы не допустить отхода гитлеровцев из Полоцка на северо-запад и запад.

С утра 1 июля дивизии 22-го и 23-го гвардейских стрелковых корпусов перешли в решительную атаку. В течение первых двух дней враг беспрерывно контратаковал. Каждый дом гвардейцы брали с боем. Для поддержки штурма пришлось привлечь значительную часть авиации, в первую очередь штурмовой. Массированные удары по огневым позициям артиллерии и минометов привели к заметному ослаблению огневой мощи противника и вынудили его прекратить контратаки. Ударами бомбардировочной и штурмовой авиации было прервано всякое движение по железной дороге Даугавпилс – Полоцк, что серьезно затруднило фашистам дальнейшую переброску сюда подкреплений.

3 июля наступил перелом в нашу пользу. Уже в первой половине дня части 51-й гвардейской стрелковой дивизии 23-го гвардейского стрелкового корпуса вели

ожесточенный бой в северо-восточной и восточной частях города.

Убедившись в том, что освобождение Полоцка и разгром полоцкой группировки противника предрешен, я поспешил в штаб фронта».

– Пад націскам Чырвонай арміі немцы 3 ліпеня хаатычна ўцякалі з Полацка, пакідаючы на сваім абарончым рубяжы шмат зброі і тэхнікі, – расказвае Сяргей Пятровіч. – Апошнія з іх здаліся раніцай 4 ліпеня. У гэты ж дзень да асабовага складу 1-га Прыбалтыйскага фронту быў даведзены загад Вярхоўнага галоўнакамандуючага І. Сталіна, адрасаваны генералу арміі І. Баграмяну. У ім гаварылася: «У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне Полацкам, прадставіць да прысваення наймення «Полацкіх» і да ўзнагароджання ордэнамі. Сёння, 4 ліпеня, у 22 гадзіны сталіца нашай Радзімы Масква ад імя Радзімы салютуе доблесным войскам 1-га Прыбалтыйскага фронту, якія авалодалі Полацкам, дваццаццю артылерыйскімі залпамі з двухсот дваццаці гармат. За выдатныя баявыя дзеянні аб'яўляю падзяку падначаленым Вам войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне Полацка».

У цэлым жа па выніках баёў у канцы чэрвеня – пачатку ліпеня 1943 года 31 вайсковае падраздзяленне было ўдастоена ганаровага наймення «Полацкіх». Дзясяткам салдат, афіцэраў і генералаў было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, тысячы з іх узнагароджаны ордэнамі і медалямі…

## Памяць аб героях

Паводле прыблізных даных, больш за 600 салдат і афіцэраў Чырвонай арміі загінулі ў баях за вызваленне Полацка. Яны пахаваны на некалькіх гарадскіх могілках у брацкіх магілах, на якіх сёння ўзвышаюцца абеліскі і манументы Славы. А самы першы помнік загінуўшым героям-вызваліцелям з'явіўся ў Полацку неўзабаве пасля заканчэння баёў, у верасні 1944 года. Яго ўстанавілі ў скверы на цэнтральнай плошчы – сучаснай плошчы Свабоды, на брацкай магіле 16 воінаў-герояў, якія найбольш вызначыліся пры вызваленні горада. Яго аўтарам быў капітан А. Пянькоў. Аднак з-за недасканаласці будаўнічых матэрыялаў, з якіх быў выраблены помнік, узнікла неабходнасць у яго замене, і ў 1981 годзе на яго месцы з'явіўся новы манумент. Сярод 16 прозвішчаў, якія значацца на ім, ёсць і імя Героя Савецкага Саюза малодшага лейтэнанта Васіля Халева, танк якога першым з боем уварваўся ў Полацк.






▲ Помнік 23 героям-гвардзейцам у г. Полацку і мемарыяльная дошка з імёнамі ўдзельнікаў памятнага дэсанта

Афіцыйная біяграфія ва ўзнагародным лісце героя-танкіста невялікая. Васіль Халеў нарадзіўся ў 1913 годзе ў Казані. Вучыўся ў пяхотным і танкавым вучылішчах. На франтах Вялікай Айчыннай з чэрвеня 1941 года. У чэрвені 1942-га быў паранены. У 1944-м, пасля заканчэння афіцэрскіх

▼ Танк – помнік членам танкавага экіпажа пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза В. Халева, якія першымі ўварваліся ў г. Полацк пры яго вызваленні ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў



курсаў, В. Халева прызначылі камандзірам танка ТО-34. У адрозненне ад легендарнага танка Перамогі – «трыццацьчацвёркі», гэтая баявая машына была ўзброена аўтаматычным парахавым поршневым агнямётам, які ўсталёўвалі замест кулямёта. Экіпаж «вогненнага танка» складаўся з трох чалавек. Вонкава ТО-34 не адрозніваўся ад Т-34, што дазваляла зблізіцца з жывой сілай праціўніка і раптоўна замест кулямётнай чаргі выпусціць струмень полымя. Спецсумесі хапала прыкладна на 10 выстралаў. Была і небяспека: калі варожы снарад прабіваў браню і пашкоджваў бак, то ў экіпажа не было шанцаў на выратаванне.

У Полацкай наступальнай аперацыі ўдзельнічаў 47-ы асобы агнямётны танкавы полк. Штурмавалі варожыя ўмацаванні дзевяць ТО-34. Непасрэдна ж да Полацка прарваліся толькі пяць, сярод якіх быў і «вогненны танк» В. Халева. Раніцай 2 ліпеня яго экіпаж першым ўварваўся ў паўднёвую частку горада і пачаў пракладваць шлях пяхоце. На вузкіх вуліцах ішоў гарачы бой. Аднак выключную мужнасць і адвагу, баявое майстэрства праявілі камандзір Халеў і яго экіпаж. Калі варожы снарад разарваў гусеніцу, іх танк застыў на месцы. Але савецкія воіны не адступілі з завяванага рубяжа, сталі расстрэльваць ворага з гарматы, збівалі іх полымем агнямёта. Калі ж закончыўся боекамплект, у ход пайшлі гранаты. Гітлераўцы спрабавалі ўзяць адважных салдат у палон – не змаглі. Тады яны падпалілі «вогненны танк» ...

– У баях за Полацк цэлым і непашкоджаным застаўся толькі адзін ТО-34, – дадае С. Капыл. – Смерцю храбрых загінулі камандзіры танкаў – малодшыя лейтэнанты Іваноў, Халеў, Яжоў, Ціханаў, малодшыя сяржанты Шарстнёў, Коба, Русінаў, старшына Каваленка, сяржант Коршунаў... Усе яны былі героямі, але медалём «Залатая Зорка» пасмяротна ўзнагароджаны толькі Васіль Халеў. У горадзе, які ён вызваляў, у раёне Грамы, ёсць вуліца яго імя. Увекавечылі подзвіг танкістаў і ў метале. У 1980 годзе танк самай масавай серыі Т-34-85 усталявалі на развязцы дарог на ўездзе ў Полацк. На вежы танка намаляваны гвардзейскі значок і нумар «823». На пастаменце – мемарыяльная дошка, якая захоўвае памяць пра гераізм танкавага экіпажа на чале з Героем Савецкага Саюза В. Халевым…

Наогул жа ў багатым на гістарычную памяць Полацку ўстаноўлена некалькі дзясяткаў помнікаў і мемарыяльных дошак, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны. У ліку іх і манумент на вуліцы Ніжне-Пакроўскай у гонар подзвігу 23 герояў-гвардзейцаў, якія коштам свайго жыцця пад шквальным агнём праціўніка адваявалі ў яго мост цераз Заходнюю Дзвіну і ўтрымлівалі заняты плацдарм да падыходу асноўных савецкіх войскаў.

3 ліпеня 1944 года з поўдня да Полацка падышлі воіны 158-га гвардзейскага стралковага палка 51-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Іх аддзяляла ад цэнтральнай часткі горада Заходняя Дзвіна. Адчуўшы пагрозу прарыву нашых часцей у цэнтр Полацка, гітлераўцы ўзарвалі чыгуначны і аўтамабільны масты. Пасля чаго з трох наяўных мастоў ацалеў толькі адзін – у заходняй частцы горада. Праціўнік захаваў яго, бо спадзяваўся: па ім прыйдзе падмога падраздзяленням, што трымалі абарону ў цэнтры Полацка. Гэта быў нешырокі драўляны мост, які надзейна ахоўваўся. Ён быў замініраваны, і гітлераўцы разлічвалі падарваць яго толькі ў самым крайнім выпадку.

Савецкае ж камандаванне вырашыла выкарыстаць мост для пераправы сваіх войскаў у цэнтральную частку горада. Выкананне задачы па захопу моста камандзір штурмавой групы 158-га палка 51-й гвардзейскай стралковай дывізіі дaручыў гвардыі лейтэнанту А. Грыгор'еву. Той для выканання загаду адабраў 22 салдат і павёў іх у бой. Ім удалося штурмам авалодаць пераправай і замацавацца на невялікім пятачку на правым беразе Заходняй Дзвіны. Спрабуючы выбіць смельчакоў з занятага імі плацдарма, немцы правялі чатырнаццаць атак. Аднак кожны раз сустракалі адчайнае супраціўленне. У рэшце рэшт яны падцягнулі танкі і агнямёты і толькі з іх дапамогай змаглі зламаць супраціў гвардзейцаў, якія коштам жыцця выканалі свой салдацкі абавязак. Неўзабаве да месца бою падышла артылерыя і шквальным агнём знішчыла варожыя ўмацаванні на правым беразе ракі.

Подзвігу 23 воінаў-гвардзейцаў прысвяціў пранікнёныя словы і вядомы рускі паэт і бард Юрый Візбар. Ён наведваў Полацк і пранікся подзвігам і самаахвярнасцю



◀ Помнік савецкім воінам – вызваліцелям Полацка, устаноўлены ў 1944 годзе




▲ Мемарыял «Вызваліцелям Полацка», узведзены на месцы помніка 1944 года

салдат, пасля чаго ў яго з'явілася песня «Цена жизни». Ёсць там і такія радкі:

*Этот город называется Полоцк,*
*Он войною на две части расколот,*
*Он расколот на две части рекою,*
*Полной тихого лесного покоя…*
*…Беги вперед, беги, стальная пехота –*
*Двадцать два гвардейца и их командир.*
*Драконовским огнем ревут пулеметы,*
*Охрана в укрепленьях предмостных сидит.*
*Да нет, она бежит! В рассветном тумане*
*Грохочут по настилу ее сапоги,*
*И мост теперь уж наш! Гвардейцы, вниманье:*
*С двух сторон враги, с двух сторон враги!..*

Доўгі час лічылася, што ўсе гвардзейцы загінулі. Аднак старшына Міхаіл Кажэўнікаў застаўся жывы. Яго, цяжка параненага, прысыпала фантанам зямлі, які ўтварыўся пры разрыве снарада. Гэта заўважыў адзін з санітараў, і калі мост ужо быў адбіты ў ворага, ён знайшоў тое месца і адкапаў салдата, які цудам аказаўся жывым. Яго перапраўлі ў медсанбат, а адтуль у адзін са шпіталяў. Пасля дэмабілізацыі М. Кажэўнікаў працаваў на будаўніцтве Куйбышаўскай ГЭС, затым шафёрам на Стаўраполлі, а ў сярэдзіне 1980-х пераехаў у Полацк.

Памяць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны свята захоўваецца ў полацкім Музеі баявой славы. У яго пяці залах – больш за тысячу музейных экспанатаў, якія расказваюць падрабязнасці стварэння Полацкага ўмацаванага раёна, абароны Полацка (з 27 чэрвеня па 15 ліпеня 1941 года), жыцця горада ў перыяд нямецкай акупацыі, дзейнасці падпольных арганізацый і партызанскага руху на Полацкай зямлі і, вядома ж, вызвалення Полацка (з 29 чэрвеня па 4 ліпеня 1944 года). Значнае месца ў экспазіцыі займаюць матэрыялы, якія распавядаюць пра палачан – Герояў Савецкага Саюза.

А сваім нараджэннем у 1971 годзе музей абавязаны ініцыятыве супрацоўнікаў Полацкага краязнаўчага музея В. Траццяковай і В. Купрыянава, а таксама размешчанаму побач Кургану Бессмяротнасці. Яго насыпалі палачане ў 1966 годзе. Зямля для яго дастаўлялася з месцаў баёў. Тады ж у аснову мемарыяла заклалі і памятную капсулу з наказам ускрыць яе ў 2017 годзе. Штогод у Дзень Перамогі і 3–4 ліпеня, калі палачане разам з дзяржаўным святам Незалежнасці адзначаюць і чарговую гадавіну вызвалення свайго горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, гэта месца становіцца самым шматлюдным у горадзе.

**Сяргей ГАЛОЎКА**

**Фота аўтара і з фондаў філіяла «Музей баявой славы» Полацкага нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка**